**Войтаў, І.** Барысаў — Масква — Тэрмез / І. Войтаў // Міёрскія навіны. — 2013. — 23 лют. — С. 3.

## БАРЫСАЎ – МАСКВА – ТЭРМЕЗ



**Цяпер на Міёршчыне пражывае 71 воін-афганец. Кожнаму з іх хвала і гонар. І не дай Бог нікому зведаць і пабачыць таго, што давялося пražыць ім, 18–20-гадовым хлопцам, якія пачалі сваё дарослае жыццё з вайны. Шмат гадоў назад прайшоў школу жыццёвай загартоўкі ў Афганістане і Вячаслаў Альфрэдавіч Ходас.**

У 1984 годзе выпускнік Міёрскай СШ № 2 Вячаслаў Ходас паступіў у Брэсцкае СПТВ № 229, каб атрымаць прафесію тэлерадыёмеханіка. Аднак праз год яго прызвалі на службу ў армію. З першых дзён салдацкага жыцця зразумеў, наколькі яно адрозніваецца ад грамадзянскага. «Не магу, не хачу, не буду», – гэтых слоў ва ўжытку ваеннаслужачых няма. На першым плане дысцыпліна і жорсткае захаванне статута. Напачатку хлопец трапіў у ваенную часць у Барысаў, дзе затрымаўся ненадоўга – праз тыдзень адправілі ў Маскву.

– Тады яшчэ не ведаў, дзе, у якой кропцы вялікай краіны СССР буду праходзіць службу. Зразумеў, што шлях мой ляжыць на поўдзень, калі ўбачыў прадстаўніка ваеннай часці, сяржанта, што прыехаў за навабранцамі: на двары – зіма, а ён як смоль загарэлы. Не паведамляў ён куды накіруемся, дзе будзе канчатковы прыпынак, а мы і не дапытваліся, – прыгадвае В. А. Ходас. – Поездам даехалі да Узбекістана. У ваеннай часці ў Тэрмезе прайшоў курс маладога байца. Кожны, хто там служыў, разумеў, што давядзецца выконваць воінскі абавязак у складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у суседняй замежнай краіне.

Вестка пра тое, што Вячаслаў трапіў служыць ва Узбекістан, вельмі ўстрывожыла яго бацькоў. Маці Ірына Станіславаўна вырашыла пабачыцца з сынам, пакуль яго не адправілі за мяжу. Да сваёй «крывіначкі», да свайго хлопчыка ляцела самалётам. Колькі выплакала слёз у тыя дні і колькі пазней, пакуль сын служыў, толькі ёй адной вядома.



9 лютага 1986 года Вячаслаў Альфрэдавіч Ходас ужо быў у Афганістане. Бацькі ўважліва ўчытваліся ў кожны радок яго «скупых» пісьмаў, што прыходзілі здалёку. Пісаў ён, што ўсё у іх добра, бо і родных не хацеў хваляваць, і не мог нічога лішняга паведаміць: кожны салдацкі ліст «праходзіў кантроль». Зваротны адрас на канвертах – в/ч п. п. 51854. Дзве літаркі «п. п.» сведчылі пра тое, што адрасат за мяжой. Такія ж паметкі ставілі на пісьмах і бацькі Вячаслава, калі накіроўвалі яму свае вестачкі.

В. А. Ходас зазначае, што на афганскай вайне жыццё кожнага савецкага салдата падвяргалася небяспецы. У любы момант, у любым месцы маглі напасці душманы, якія не былі літасцівымі. На дарогах можна было і на міне падарвацца, і пад жорсткі абстрэл праціўніка трапіць. Варожыя фарміраванні нападалі на аўтамабільныя калоны, нават калі яны перавозілі гуманітарны

груз, а таму машыны заўсёды рухаліся ў суправаджэнні баявой тэхнікі, хаця і гэта не было гарантыяй бяспекі.

– Ці баяўся ў такія моманты трапіць пад кулю? У падобных сітуацыях няма часу для эмоцый. Адчуванні прыходзілі пазней, калі мінала пагроза. Толькі гэта ўжо быў не страх, а нейкае зусім іншае пачуццё: спачуванне і горыч, калі гінулі людзі ці радасць, калі засталіся жывымі, – кажа ўдзельнік афганскай вайны. – Канешне, нашым салдатам, калі не мелі добрай баявой падрыхтоўкі, любыя ваенныя дзеянні весці на чужой тэрыторыі ў нязвыклых кліматычных і ландшафных умовах было складана.

Як і ўсе салдаты, 18-гадовы Вячаслаў лічыў дні ад пачатку да завяршэння службы. Праўда, у Афгане жыццё вымяралася не днямі, і нават не гадзінамі, а хвілінамі. Прайшоў юнак праз многія выпрабаванні. Многае бачыў, перажыў.

Дэмабілізаваўся В. А. Ходас у званні сяржанта праз два гады пасля прызыву – 10 лістапада 1987 года. Амаль тыдзень дабіраўся цягнікамі на Міёршчыну. Загадзя паведаміць родным пра вяртанне не змог. А таму ні на вакзале, ні на парозе дома яго ніхто не сустракаў. Аказалася, што бацькі ў той дзень былі ў родных ажно ў Кобрыне. Прыезд сына стаў для іх прыемнай і вельмі радаснай нечаканасцю.

Затрымацца Вячаславу ля бацькоў надоўга не давялося. Накіраваўся ў Брэст, каб закончыць вучобу ў вучылішчы. І менш чым праз год стаў радыёмеханікам па абслугоўванні і рамонце радыётэлевізійнай аппаратуры 5 разраду. Яго накіравалі на першае працоўнае месца – у радыётэлевізійнае атэлье ў Паставы. У 1989-ым памяняў месца жыхарства на вёску Лужкі, ажаніўся і працаваў радыёмеханікам у Шаркаўшчыне. У 1992-ім сям’я павялічылася – нарадзіўся сын. Праз два гады Вячаслаў Альфрэдавіч прыехаў з сям’ёй ў Міёры. Працаўладкаваўся напачатку вадзіцелем у ПМК-23. Але да гэтай работы душа не ляжала. Звольніўся і заняўся прадпрымальніцкай дзейнасцю па рамонце радыётэлевізійнай апаратуры. У чэрвені 1998 года яго прынялі электраманцёрам ахоўна-пажарнай сігналізацыі ў раённы аддзел аб’яднання «Ахова» (пазней гэтая ўстанова перайменавана ў Міёрскае ддзяленне Дэпартамента аховы МУС РБ), дзе і зараз працуе. Гэта высокакваліфікаваны работнік. Камунікабельнасць, ветлівасць і тактоўнасць дапамагаюць яму ў паўсядзённай працы лёгка кантактаваць з людзьмі. За працяглы перыяд работы не меў дысцыплінарных спагнанняў.




Свой вопыт работы перадаў 7 вучням, якія пад яго настаўніцтвам хутка асвойвалі ўсе тонкасці спецыяльнасці. Вячаслаў Альфрэдавіч, як і іншыя электраманцёры службы аховы, строга па графіку абслугоўвае абсталяванне на шматлікіх аб’ектах горада і раёна. У любы час сутак ён гатовы выехаць па выкліку на адказны ўчастак. Каб ісці ў нагу з часам і прагрэсіўнымі тэхналогіямі, пастаянна павышае прафесійны ўзровень.

Жонка Вячаслава Альфрэдавіча таксама працуе ў аддзяленні аховы, у вартаўнічай службе. Сын Сяргей вучыцца ў Віцебскім політэхнічным каледжы. Ужо запланаваў стварыць уласную сям’ю. Усё ў жыцці воіна-інтэрнацыяналіста ідзе, як кажуць, сваім парадкам. Мае ўласны ўтульны дом, сям’ю. Паважаюць на працы. Можа шмат чаго прыемнага прыгадаць з мінулага і расказаць шмат цікавага пра сённяшняе жыццё. Толькі пра гады службы ў Афганістане адказвае коратка: «Служыў, як і ўсе. Вярнуўся жывым, не пакалечаным, а гэта галоўнае». Неахвотна расказвае пра

ваенныя салдацкія будні, стараецца іх «заблакіраваць» у памяці, бо не хочацца лішні раз трывожыць душу. Са шкадаваннем прыгадвае землякоў, якія адтуль не вярнуліся дадому.

– Усім хто прайшоў Афганістан, хто вытрымаў нялёгкія выпрабаванні, хачу пажадаць здароўя і поспехаў, а сённяшнім і будучым салдатам – каб ніколі не давялося праходзіць службу ва ўмовах рэальных баявых дзеянняў, – зазначыў Вячаслаў Альфрэдавіч. – Вайна – гэта вайна, і там гінуць людзі.

***І. Войтаў,***

***Начальнік Міёрскага аддзялення Дэпартамента аховы МУС РБ***

*На здымках: В. А. Ходас на вайне ў Афганістане з сябрам і за мірнай працай у службе аховы*